# 12 ЛІСТАПАДА — 150 ГАДОЎ З ДНЯ НАРАДЖЭННЯ Г. Б. МІСУНА (1868—1922), ВУЧОНАГА-ГЕОЛАГА БЕЛАРУСІ І РАСІІ

Геалагічнымі даследаваннямі на тэрыторыі Беларусі займаліся многія вядомыя вучоныя — А. Э. Гедройц, П. А. Тутkoўскі, А. П. Карпінскі і інш. Сярод іх была і Ганна Баляславаўна Місуна — першая жанчына-геолаг.

Яна нарадзілася ў сядзібе Забалацце Лепельскага павета Віцебскай губерні (цяпер Полацкі раён Віцебскай вобласці) у сям'і збяднелага шляхціца. У 1887 г. скончыла прыватную польскую гімназію ў Рызе і некаторы час працавала там настаўніцай. Праз тры гады вярнулася на радзіму. Займалася самаадукацыяй: вывучала прыродазнаўства, вяла перапіску з Варшаўскім таварыствам даследчыкаў прыроды, збірала калекцыі насякомых і раслін Лепельшчыны, рыхтавала навукова-папулярныя артыкулы. У 1893—1896 гг. Г. Б. Місуна вучылася на прыватных жаночых курсах у Маскве, дзе чыталі лекцыі такія вядомыя вучоныя, як А. П. Паўлаў, М. А. Мензбір, У. І. Вярнадскі, У. Д. Сакалоў і інш. Вясной 1898 г. у Берліне ўдасканальвала веды ў групе вядомага гляцыёлага, прафесара Ф. Гейнітца. У гэтым жа годзе ўдзельнічала ў экспедыцыі, якая займалася пошукамі жалезнай руды і каменнага вугалю на тэрыторыі Тульскай губерні. У 1906 г. Г. Б. Місуна стала асістэнтам пры геалагічным кабінеце Маскоўскіх вышэйшых жаночых курсаў, дзе чытала лекцыі па петраграфіі, палеанталогіі, гістарычнай геалогіі. З 1919 г. працавала прыват-дацэнтам геалагічнага факультэта Маскоўскага ўніверсітэта. Разам з У. Д. Сакаловым арганізавала першую ў Расіі школу жанчын-геолагаў. Яе вучаніцамі былі В. А. Варсанофʼева, Д. М. Раўзер-Чарнавусава, Т. А. Дабралюбава і іншыя знакамітыя вучоныя.

Асновай большасці навуковых прац Г. Б. Місуна сталі даследаванні, атрыманыя пры палявых геалагічных работах. У 1898—1901 гг. яна самастойна вывучала рэльеф у басейнах Заходняй Дзвіны і Нёмана. З дапамогай выпадковых рабочых і галоўным чынам на ўласныя зберажэнні, а таксама на невялікія субсідыі Маскоўскага таварыства выпрабавальнікаў прыроды і Расійскага мінералагічнага таварыства, выканала вялікую даследчую працу. Яна дала навуковае тлумачэнне ледавіковаму рэльефу Беларусі. Першая ў Расіі прапанавала методыку вывучэння канцавых марэн і краявых ледавіковых утварэнняў у цэлым, выявіла сярод чацвярцічных утварэнняў сляды некалькіх зледзяненняў. Вывучала геалогію цэнтральнай і заходняй частак Беларусі, лёсавыя адклады Навагрудскага ўзвышша, склала карту-даведнік будаўнічых матэрыялаў на значнай частцы тэрыторыі нашай краіны, праводзіла гідрагеалагічныя і геалагічныя пошукі ў Расіі. З 17 вядомых навуковых работ Г. Б. Місуна 9 прысвечаны пытанням геалагічнай будовы Беларусі і прылягаючых тэрыторый Літвы і Польшчы. Сярод іх «Материалы к изучению конечных морен Литовского края» (1898 ці 1899), «Конечная морена и устройство поверхности северо-восточной части Гродненской губернии» (1911), «Краткий очерк геологического строения Новогрудского уезда Минской губернии» (1914) і інш. У астатніх працах

10р69к



разглядаюцца пытанні геалогіі Крыма, Падмаскоўя і Калінінскай вобласці.

Ганна Баляславаўна Місуна з'яўлялася членам Усерасійскага мінералагічнага і Рускага палеанталагічнага таварыстваў, Таварыства імя М. Каперніка ў Львове. Доўгія гады была захавальніцай геалагічных калекцый Маскоўскага таварыства даследчыкаў прыроды. Яна выступала з дакладамі на навуковых канферэнцыях, у 1910 г. прымала ўдзел у рабоце Міжнароднага геалагічнага кангрэса ў Стакгольме.

Памёрла Г. Б. Місуна 2 мая 1922 г. у Маскве. Пахавана на Новадзявочых могілках. У 2003 г. на радзіме даследчыцы і ў г. п. Ветрына (Полацкі раён Віцебскай вобласці) былі ўстаноўлены мемарыяльныя знакі. Імем першай жанчыны-геолага названы вуліцы ў Полацку і ў г. п. Ветрына.


**Місуна Ганна Баляславаўна** // Беларуская энцыклапедыя : у 18 т. — Мінск, 2000. — Т. 10. — С. 474.

**Миссуна Анна Болеславовна** // Геологи и горные инженеры Беларуси : биогр. справ. : [в 2 ч.] / Белорус. науч.-исслед. и проект.-конструктор. ин-т гор. и хим. пром-сти [и др. ; сост.: А. Д. Смычник и др. ; науч. ред.: Р. Г. Гарецкий, А. Д. Смычник, Я. И. Аношко]. — Минск, 2008. — Ч. 1. — С. 158—159.

**Місуна Ганна Баляславаўна** (12.11.1868 г. — 2.5.1922 г.) // 250 асоб з Беларусі ў дыялогах культур = 250 people from Belarus in the dialogue of cultures / [рэд.: Т. Л. Пісарэнка, Л. У. Языковіч ; пер. на англ. мову Л. М. Серады]. — Мінск, 2008. — С. 127—128.

**Гарецкий, Р. Г.** Начальные представления о строении недр / Р. Г. Гарецкий, Э. А. Левков // Очерки истории науки и культуры Беларуси IX — начала XX в. / [П. Т. Петриков и др.] ; АН Беларуси, Ин-т истории, Комис. по истории науки. — Минск, 1996. — С. 465—469. (См. на с. 467—468.)

**Гордеев, Д. И.** А. Б. Миссуна — первая женщина-геолог Белоруссии / Д. И. Гордеев // История геологического изучения территории Белоруссии / [Д. И. Гордеев и др.] ; АН БССР, Ин-т геохимии и геофизики. — Минск, 1976. — С. 86—88.

**Карасёў, В. Р.** Сядзіба Забалацце — радзіма Ганны Місуны / Віктар Карасёў // Па гістарычных мясцінах Полацкай зямлі / Віктар Карасёў. — Мінск, 2011. — С. 20—22.

**Карасёў, В. Р.** Зорачка яе лёсу заззяла на полацкай зямлі : да 135-годдзя Г. Б. Місуна, першай на Беларусі і ў Расіі жанчыны-геолага / Віктар Карасёў // Мая любоў — Ветрына : гіст. нарысы / Віктар Карасёў. — Полацк, 2004. — С. 104—106.

**Марціновіч, А. А.** Смелы памірае адзін раз... : Ганна Місуна / Алесь Марціновіч // Хто мы, адкуль мы... гіст. эсэ, нарысы : у 3 кн. / Алесь Марціновіч. — Мінск, 2008. — Кн. 3. — С. 47—61.

**Масляніцына, І.** Жанчыны ў гісторыі Беларусі / Ірына Масляніцына, Мікола Багадзяж // Беларускі гістарычны часопіс. — 2005. — № 6. — С. 49—55. (Гл. на с. 51.)

**Аношка, Я. І.** Ганна Баляславаўна Місуна / Я. І. Аношка // Літасфера. — 2008. — № 2. — С. 191—192.

**Санько, А. Ф.** Уклад Г. Б. Місуны ў пазнанне ледавіковай фармацыі Беларусі / А. Ф. Санько // Літасфера. — 1998. — № 9. — С. 156.

**Александровіч, Д.** Дачка Беларусі / Д. Александровіч // Родная прырода, 1998. № 5. — С. 27.

**Ляўкоў, Э.** Першая жанчына-геолаг Беларусі / Эрнст Ляўкоў // Родная прырода, 1984. — № 2. — С. 16.


*Е. Д. Варанько,*
*вядучы бібліёграф Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі*



Нацыянальная бібліятэка Беларусі